ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 4 (243) | Субота, 12 лютага 1977 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

# ДАСТОЙНА СУСТРЭНЕМ 60-ГОДДЗЕ КАСТРЫЧНІКА!

## БЮРО ЦК ВЛКСМ ПРЫНЯЛО ПАСТАНОВУ: АБ АРГАНІЗАЦЫЙНАЙ І АГІТАЦЫЙНА-ПРАПАГАНДЫСЦКАЙ РАБОЦЕ КАМІТЭТАЎ КАМСАМОЛА Ў СУВЯЗІ З ПАДРЫХТОЎКАЙ ДА 60-ГОДДЗЯ ВЯЛІКАГА КАСТРЫЧНІКА

**Ленінскі камсамол, уся савецкая моладзь з велізарным натхненнем успрынялі пастанову ЦК КПСС «Аб 60-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі».**

У гэтым важнейшым ідэйна-тэарэтычным і палітычным дакуменце глыбока і ярка ахарактарызавана сусветна-гістарычнае значэнне Кастрычніка як галоўнай падзеі XX стагоддзя, якая карэнным чынам змяніла ход развіцця чалавецтва, пераканаўча раскрыта вялікая жыццёвая сіла ідэй марксізму-ленінізму. Пастанова ЦК КПСС дае шырокую панараму дынамічнага развіцця нашага сацыялістычнага грамадства, дасягненняў у эканоміцы, навуцы, культуры, росце народнага дабрабыту.

Выдатнае месца ў летапісе камуністычнага будаўніцтва займае апошняе дзесяцігоддзе, у якое практычна падвоіўся эканамічны патэнцыял краіны, створаны на працягу папярэдняга паўстагоддзя, істотна павысіўся узровень жыцця савецкіх людзей.

Гераічная гісторыя, рэвалюцыйныя, баявыя і працоўныя традыцыі савецкага народа непарыўна звязаны з дзейнасцю створанай Леніным партыі камуністаў. Сучасны перыяд характарызуецца далейшым павышэннем кіруючай ролі партыі ў грамадстве, узмацненнем яе тэарэтычнай, палітычнай і арганізатарскай дзейнасці.

КПСС дастойна выконвае ролю палітычнага правадыра рабочага класа, усіх працоўных, усяго народа. Камуністычная партыя высока нясе рэвалюцыйны сцяг марксізму-ленінізму і пралетарскага інтэрнацыяналізму, з гонарам ажыццяўляе сваю гістарычную місію, нястомна змагаецца за трыумф камуністычных ідэалаў.

**Камсамольцы, савецкая моладзь горача адабраюць і аднадушна падтрымліваюць плённую творчую работу Цэнтральнага Камітэта КПСС, яго Палітбюро на чале з выдатным палітычным і дзяржаўным дзеячам сучаснасці, верным марксістам-ленінцам, нястомным барацьбітом за камунізм і мір на зямлі Генеральным сакратаром ЦК КПСС таварышам Л. І. Брэжневым.**

Камсамольцы, юнакі і дзяўчаты Краіны Саветаў, беззапаветна адданыя Камуністычнай партыі, імкнуцца заўсёды і ўсюды быць на перадавых рубяжах, самааддана працаваць і змагацца за камунізм. Сённяшнія здзяйсненні савецкай моладзі — прамы працяг справы Кастрычніка, практычнае ўвасабленне ідэй і запаветаў вялікага Леніна.

Пераканаўчым сведчаннем ідэйнай і маральнай сталасці маладога пакалення з'яўляюцца магутны палітычны ўздым, душэўны парыў, працоўны энтузіязм, з якім савецкая моладзь удзельнічае ва ўсенароднай барацьбе за выкананне гістарычных рашэнняў XXV з'езда КПСС, рыхтуецца дастойна сустрэць юбілей Вялікага Кастрычніка.

60-годдзе Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі— падзея велізарнага значэння для Ленінскага камсамола, усіх юнакоў і дзяўчат Савецкай шматнацыянальнай Радзімы. Высокая ацэнка дзейнасці ВЛКСМ як арганізатара савецкай моладзі, надзейнага памочніка і рэзерву партыі, дадзеная ў пастанове ЦК КПСС, выклікае прылiў сіл, кліча на штурм новых вышынь у барацьбе за камунізм.

Патрабаванне партыі **«Працаваць лепш, павышаць эфектыўнасць і якасць!»** вызначае сёння змест работы кожнай камсамольскай арганізацыі, кожнага камсамольца. Савецкія юнакі і дзяўчаты разгарнулі баявое спаборніцтва за ганаровае права падпісаць Рапарт Ленінскага камсамола Цэнтральнаму Камітэту КПСС, прысвячаюць 60-годдзю Кастрычніка 60 ударных тыдняў.

Камуністычная партыя, праяўляючы сапраўды ленінскія клопаты аб моладзі, ставіць новыя, адказныя задачы па фарміраванню ідэйна загартаваных, актыўных і свядомых будаўнікоў новага грамадства.

XXV з'езд КПСС паставіў перад савецкім народам задачы небывалага маштабу і гістарычнай навізны. Важную ролю ў іх ажыццяўленні партыя адводзіць камсамолу, савецкай моладзі. Каб быць на узроўні патрабаванняў партыі, неабходна павысіць эфектыўнасць і якасць усёй камсамольскай работы, баявітасць камсамольскіх арганізацый, камсамольскіх груп. Камуністычная ідэйнасць, актыўная жыццёвая пазіцыя, маральная чысціня павінны вызначаць кожнага камсамольца, кожнага маладога савецкага чалавека.

**Надаючы выключна важнае значэнне мабілізацыі камсамольцаў і моладзі на дастойную сустрэчу 60-годдзя Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, далейшаму ўзмацненню ідэйна-палітычнага, працоўнага і маральнага выхавання юнакоў і дзяўчат, бюро ЦК ВЛКСМ пастанаўляе:**

(Заканчэнне на 2-й стар.).

# ЗАСВЕДЧЫЛІ АДЗНАКІ

### ДА ВЫНІКАЎ ЗІМОВАЙ СЕСІІ

Ва ўніверсітэце пачаўся другі семестр навучальнага года. Пасля канікулаў улегліся хваляванні ад зімовай залікова-экзаменацыйнай сесіі. Цяпер ужо можна падвесці некаторыя яе вынікі. Скажам адразу: яны не асабліва задавальняюць. Нават пры ўзрослых патрабаваннях дасягнуты ўзровень паспяховасці не адпавядае магчымасцям студэнтаў. Па ўніверсітэту яна склала 90,7 працэнта — на 1,5 працэнта ніжэй леташняга.

Па факультэтах паспяховасць характарызуецца такімі паказчыкамі: біялагічны — 98, гісторыка-філалагічны — 97,5, эканамічны — 92,7, фізвыхавання —92, геалагічны — 91,5, фізічны — 90,1, механіка-матэматычны — 77,2 працэнта. У параўнанні з мінулагоднім паспяховасць за зімовую сесію павысілася: на біялагічным — на 2,9, фізвыхавання — 9,3, геалагічным — 1,3, фізічным факультэце — 0,1 працэнта. На трох факультэтах яна панізілася. Асабліва здаў свае пазіцыі мехмат. Тут паспяховасць студэнтаў сёлета апусцілася на 12,9 (!) працэнта. Некалькі не дацягнулі да мінулагодняга ўзроўню гісторыка-філалагічны і эканамічны факультэты — адпаведна на 0,7 і 1,6 працэнта.

На жаль, не радуе нас і якасны паказчык паспяховасці. Тут таксама замест росту назіраецца пэўны спад. Толькі ўсяго 342 студэнты ўніверсітэта вытрымалі зімовую сесію на выдатныя адзнакі. Гэта паказчык, які крыху не дацягнуў дзесяці працэнтаў. Мы ж даўно ставім задачу, каб ён быў у паўтара, а то і ў два разы вышэйшым.

Найбольшая колькасць выдатнікаў у працэнтным вылічэнні на біялагічным факультэце — 16,3. У гэтым сэнсе заслугоўвае пахвалы фізічны факультэт. Хоць ён і з'яўляецца адным з самых цяжкіх ва ўніверсітэце, але па выніках зімовай сесіі тут маюць 14,6 працэнта выдатнікаў. На гісторыка-філалагічным факультэце іх 12,2, эканамічным — 7,9, фізвыхавання — 7, геалагічным — 6,4 і механіка-матэматычным — усяго толькі 4,8 працэнта.

На добрыя і выдатныя адзнакі вытрымалі зімовую сесію 678 студэнтаў. Таксама недастаткова — менш 20 працэнтаў. Калі браць у цэлым, дык атрымоўваецца, што больш 70 працэнтаў студэнтаў маюць задавальняючыя адзнакі. І больш за ўсё нам сорамна за «хвасцістаў». Студэнтаў жа, якія атрымалі нездавальняючыя адзнакі, набралася даволі многа — 285 чалавек, прычым 17 з іх маюць па два «правалы».

Трывожыць і той факт, што сёлета 89 студэнтаў без уважлівых прычын не з'явіліся на сесію.

Найбольшая колькасць нездавальняючых адзнак пастаўлена па матэматычных дысцыплінах. У нейкай ступені гэта растлумачальна іх цяжкасцю. А вось тое, што 17 студэнтаў не вытрымалі экзамены па грамадскіх дысцыплінах, у тым ліку 9 па гісторыі КПСС, неапраўдальна.

У дзесятай пяцігодцы, ажыццяўляючы рашэнні XXV з'езда КПСС, мы працуем пад дэвізам барацьбы за эфектыўнасць і якасць. Выкладчыкі ўніверсітэта, як і ўсе работнікі вышэйшай школы, заклікаы ўсямерна ўдасканальваць вучэбна-выхаваўчы працэс, павышаць якасць падрыхтоўкі спецыялістаў для народнай гаспадаркі. Вынікі зімовай сесіі засведчылі, што для дасягнення гэтай мэты намі выкарыстоўваюцца яшчэ не ўсе магчымасці. Іх неабходна дэталёва і глыбока прааналізаваць на ўсіх факультэтах, кафедрах, у вучэбных групах з тым, каб у будучым ухіліць меўшыя месца недахопы, са значна лепшымі абсалютнымі і якаснымі паказчыкамі закончыць навучальны год і тым самым падрыхтаваць дастойную сустрэчу слаўнаму юбілею Савецкай улады —60-годдзю Вялікага Кастрычніка.

**Н. ПАПКОВА,**
**начальнік вучэбнай часткі.**



Ленінскі камсамол, уся савецкая моладзь з вялікім натхненнем успрынялі пастанову ЦК КПСС «Аб 60-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі».

З 14 па 26 лютага ва ўсіх групах нашага факультэта будзе праходзіць камсамольскі сход, прысвечаны падрыхтоўцы да 60-годдзя Вялікага Кастрычніка з парадкам дня: «Камуністычную ідэйнасць, актыўную жыццёвую пазіцыю — кожнаму камсамольцу!», на якім будуць прыняты канкрэтныя абавязацельствы камсамольцаў па дастойнай сустрэчы Вялікага Кастрычніка.

**А. АЙЗЕНШТАДТ,**
**нам. сакратара камсамольскага бюро гісторыка-філалагічнага факультэта.**

**На здымку:** камсамольцы групы Г-41 гісторыка-філалагічнага факультэта абмяркоўваюць надрукаваную ў газетах пастанову ЦК КПСС «Аб 60-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі».

Фота **А. Шчыгрова.**

## ПАСТАНОВЫ ЦК КПСС І БЮРО ЦК ВЛКСМ ЗНАЙШЛІ Ў СТУДЭНТАЎ ГДУ ГАРАЧЫ ВОДГУК

# АДКАЖАМ ВЫДАТНЫМІ СПРАВАМІ

З вялікай цікавасцю азнаёміліся камсамольцы нашага факультэта з пастановай ЦК КПСС «Аб 60-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі».

Савецкі народ уступіў у знамянальны, шасцідзесяты год існавання нашай дзяржавы. За гэтыя гады ён дабіўся вялікіх перамог. І заўсёды ў першых радах барацьбітоў за новае грамадства, за сацыялізм разам з камуністамі былі камсамольцы. Цяпер камсамол — таксама наперадзе: будоўлі стагоддзя— КАМаз і БАМ называюць ударнымі, камсамольскімі.

У гэтыя дні разам з усім савецкім народам камсамольцы сталі на ўдарную вахту ў гонар 60-годдзя Вялікага Кастрычніка. Наша працоўная вахта — выдатная вучоба.

З добрымі паказчыкамі ў вучобе сустракаюць 60-ы год Вялікага Кастрычніка камсамольцы груп М-26, М-21, М-22, у якіх пасля зімовай сесіі — па чатыры выдатнікі. Наогул, 2-гі курс найбольш паспяхова здаў залікі і экзамены. У гэтым вялікая заслуга камсорга курса Аксаны Краўчанка і адказнай за работу акадэмічнага сектара курса Таісіі Парахня. Яны рэгулярна праводзілі кансультацыі, узначальваюць навуковую работу студэнтаў.

У пастанове бюро ЦК ВЛКСМ гаворыцца аб тым, што «справа гонару кожнага камсамольца — ударнай, самаадданай працай, выдатнай вучобай дабіцца ганаровага права падпісаць Рапарт Ленінскага камсамола ЦК КПСС да 60-годдзя Кастрычніка». У нас на факультэце ў першых радах сацыялістычнага спаборніцтва за права падпісаць Рапарт ідуць камсамольцы Я. Барабанаў, І. Сіманава, І. Абалінік, А. Буяноўскі і інш. Выдатнай вучобай, вялікімі поспехамі ў навуковай і грамадскай рабоце сустракаюць яны юбілейную дату.

Мы даём слова прыкласці ўсе намаганні, каб дастойна сустрэць вялікае свята савецкіх людзей.

**С. БАДРУНОЎ,**
**нам. сакратара бюро ЛКСМБ механіка-матэматычнага факультэта.**

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, грамадскія арганізацыі ўніверсітэта, калектыў кафедры гісторыі КПСС горача віншуюць выкладчыка гісторыі КПСС ЭСМАНТОВІЧА Ігара Феафілавіча з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук.**

## Літаратурны каляндар

# НЕЗАБЫЎНЫЯ СУСТРЭЧЫ

У ЛІСТАПАДЗЕ 1969 года я была залічана ў аспірантуру Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. Калі была абрана тэма дысертацыі («Творчая задума і яе мастацкае ўвасабленне ў «Палескай хроніцы» Івана Мележа»), навуковы кіраўнік Алесь Адамовіч параіў абавязкова сустрэцца з Іванам Паўлавічам, папрацаваць у яго архіве. Я папрасіла Аляксандра Міхайлавіча дапамагчы мне ў гэтай сустрэчы. Праз некалькі дзён навуковы кіраўнік сказаў мне, што пісьменнік чакае мяне. Не паспела я яшчэ добра разабрацца ў агарнуўшых мяне думках і пачуццях, як ужо стаяла на парозе мінскай кватэры І. Мележа па вуліцы Янкі Купалы.

Дзверы адчыніў сам Іван Паўлавіч. Ён ветліва прывітаўся і нешта пачаў гаварыць пра абраную мною тэму дысертацыі. Я стаяла перад ім і не магла нічога сказаць ад хвалявання і разгубленасці. І раптам усё стала на сваё месца. Гаворка пайшла аб літаратуры, затым аб Палессі (пісьменнік вельмі ўзрадаваўся, калі даведаўся, што я яго зямлячка). Адно слова, другое, і я неяк адразу адчула, што мой субяседнік— чалавек незвычайна цікавы, з вялікім жыццёвым вопытам, з багатым запасам назіранняў і ведаў.

Іван Паўлавіч расказваў аб жыццёвых вытоках сваіх твораў, аб тым, што «ведаў лепш за ўсіх на свеце», аб родным Палессі. Ён успамінаў пра сваё басаногае дзяцінства ў невялічкай палескай вёсцы, пра бацькоў, пра сваіх землякоў— і на мяне адразу павеяла нечым такім блізкім і знаёмым. Я адразу ж нагадала і мілагучны палескі говар, і суровую, таямнічую палескую прыроду, і палешукоў — людзей шчырых і добразычлівых.

У гэтую ж першую сустрэчу мне адкрылася бясспрэчная ісціна: Іван Паўлавіч горача любіць сваё Палессе. Тут ён вырас, тут рабіў першыя самастойныя крокі ў жыццё. І таму, зразумела, што родная зямля натхняе пісьменніка на стварэнне цудоўных твораў.

З мноствам уражанняў ад першай сустрэчы з пісьменнікам вярталася я з Мінска на родную Гомельшчыну. Вярталася з цвёрдай упэўненасцю, што сустрэча гэтая не апошняя. І сапраўды, наступная сустрэча адбылася ў студзені 1970 года. І на гэты раз Іван Паўлавіч быў простым, далікатным чалавекам, без якой-небудзь позы і афектацыі.

Дзяліцца загадзя сваімі творчымі планамі і задумамі Іван Паўлавіч, відаць, не любіў, таму што на маё запытанне, над чым працуе зараз, коратка адказаў: над «Мінскім напрамкам» і над працягам «Палескай хронікі». Я паведаміла пісьменніку, што збіраюся з'ездзіць да яго на радзіму, што мне вельмі хочацца пабачыць тыя мясціны, аб якіх ён пісаў у «Палескай хроніцы», сустрэцца з яго землякамі, з тымі, хто паслужыў прататыпамі яго літаратурных герояў.

Іван Паўлавіч адгаварваў мяне ад гэтай паездкі, адгаварваў шукаць прамых прататыпаў герояў яго кніг. Пісьменніка, як прызнаўся ён мне пасля, не пакідала адчуванне, што ў такім выпадку староннi чалавек умешваецца ў таямніцы пісьменніцкай лабараторыі, дзе ўсё складана і дорага.

Але маё жаданне наведаць радзіму І. Мележа аказалася мацнейшым. Зразумела, чаму з такім хваляваннем распытваў мяне Іван Паўлавіч у час наступнай сустрэчы аб выніках маёй паездкі. Пісьменнік адчуў, што не дарэмна з'ездзіла, шмат чаго ўбачыла, пачула. Я расказвала аб знаёмых яму людзях, і раптам убачыла, як ажывіўся ён, калі я назвала дарагое для яго прозвішча — Бельскі.

Нікіфара Ануфрыевіча Бельскага пісьменнік памятаў з той даўняй пары, калі ён прыехаў у толькі што арганізаваны калгас. Для Івана Паўлавіча



ён быў і дзяцінствам, і юнацтвам, тым дарагім, што выклікала «Палескую хроніку». Старшыня калгаса, затым сельсавета, сакратар райкома, з якім будучы пісьменнік часта сустракаўся, калі працаваў у райкоме камсамола. Ён рэкамендаваў Мележа ў партыю, уручыў яму кандыдацкую картку.

А слухаючы шчырага, крыху сарамлівага Міканора Якаўлевіча Яраша — школьнага сябра пісьменніка, я імкнулася правесці паралелі паміж рэальнымі падзеямі, што адбываліся тут, на Палессі, і «Палескай хронікай». Супастаўленні далі многа цікавага, яны разам з тым прыадчынілі таямніцы пісьменніцкай лабараторыі, пісьменніцкага таленту І. Мележа.

Але найбольш яскрава гэтыя сакрэты пісьменніцкага майстэрства раскрылі рукапісы І. Мележа. Хаця Іван Паўлавіч вельмі сціпла гаварыў заўсёды аб сваіх адчуваннях і перажываннях за пісьмовым сталом, рукапісы гэтыя адкрылі той шлях, па якому ішоў празаік, увесь час удасканальваючы сваё майстэрства. Яны дапамаглі зразумець ход працы І. Мележа, характар задач, якія ставіў ён перад сабой.

Кожная новая сустрэча з І. Мележам адкрывала для мяне новыя грані яго характару, паказвала непаўторнасць яго мыслення, арыгінальнасць светаадчування, яго невычэрпны аптымізм, любоў да жыцця.

Аднойчы я застала пісьменніка дома над чарговым артыкулам аб нашай літаратуры. Горача і натхнёна даказваў ён мне, што, чым бліжэй мастак да жыцця, тым больш у яго магчымасці паказаць гістарычную рэчаіснасць у самых разнастайных яе праявах.

Своеасаблівым дзённікам, споведдзю сына-патрыёта з'яўляецца яго кніга «Жыццёвыя клопаты», удастоеная Дзяржаўнай прэміі БССР 1976 года. Яе можна чытаць як справаздачу выдатнага пісьменніка аб зробленым за 30 год грамадскай і літаратурнай дзейнасці.

Надоўга застанецца ў маёй памяці і сустрэча з пісьменнікам на нашай гомельскай зямлі. Яна адбылася ў лютым 1971 года. Іван Паўлавіч быў кіраўніком групы беларускіх пісьменнікаў, якая прыняла ўдзел у Днях беларускай літаратуры на Гомельшчыне.

Жывым і энергічным запомніўся мне Іван Пятровіч і ў сустрэчы са студэнтамі нашага ўніверсітэта, і ў сустрэчы са шматлікімі чытачамі Гомельскай абласной бібліятэкі. У кожнай з гэтых сустрэч выяўлялася незвычайная эрудыцыя пісьменніка, яго вялікая працаздольнасць, выключная арганізаванасць.

З Іванам Паўлавічам мы сустракаліся і ў Саюзе пісьменнікаў. Я адразу ж прыкмеціла, што і тут да яго адносяцца з выключнай цеплынёй і пашанай.

Іван Паўлавіч валодаў шчаслівым талентам — талентам чалавечнасці, выключнай гасціннасці, сардэчнай ласкавасці, якія моцна прываражвалі кожнага, каму даводзілася з ім сустракацца. Дзверы яго кватэры па вул. Я. Купалы і для ўсіх былі прыветліва адчынены.

Хаця Іван Паўлавіч звычайна сам размовы не заводзіў, а больш любіў слухаць, задаваць субяседніку пытанні, наша апошняя сустрэча, якая адбылася ў маі 1976 года, зрабіла на мяне асабліва моцнае ўражанне і засталася ў памяці з усімі падрабязнасцямі іменна таму, што адбылося незвычайнае: увесь час гаварыў Іван Паўлавіч, у ролі слухача была я.

Мы сядзелі з ім каля пісьмовага стала і падбіралі фотаздымкі для маёй кнігі, якая павінна была выйсці ў пачатку чэрвеня. Іван Паўлавіч расказваў і расказваў: аб сваіх сустрэчах з пісьменнікамі, з выбаршчыкамі, з вучнямі, студэнтамі. Кожны фотаздымак — гэта частка жыцця пісьменніка. Тады я яшчэ не ведала, што гэта наша апошняя сустрэча. Мы развіталіся вельмі цёпла, ён з нецярплівасцю чакаў выхаду маёй кнігі.

8 лютага пісьменніку споўнілася б 56 год. Здаецца, яшчэ ўчора, заклапочаны і ўважлівы да розных праяў жыцця, Іван Паўлавіч хадзіў па вуліцах Мінска, спяшаўся ў Саюз пісьменнікаў, сустракаўся з маладымі аўтарамі і сябрамі па рабоце, дзяліўся сваімі творчымі планамі. Я запамятала яго жывым, такім, якім ведала сем год, такім, якім пакінула яго ў той цудоўны майскі дзень 1976 года: дапытлівым і чулым, любячым жыццё і людзей, вечным шукальнікам новага, цікавага, не адкрытага нікім. Вобраз яго захаваўся ў маёй памяці, як вобраз чалавека сціплага і настойлівага, чалавека вялікага сэрца.

**В. СМЫКОЎСКАЯ,**
**старшы выкладчык кафедры беларускай літаратуры, кандыдат філалагічных навук.**

# НА ПАСЯДЖЭННЯХ ІНСПЕКЦЫІ ПА ГПА

Для аператыўнага кантролю работы падраздзяленняў універсітэта па падрыхтоўцы і арганізацыі здачы нарматываў комплексу ГПА студэнтамі і супрацоўнікамі ГДУ створана інспектарская група. Яе ўзначальвае старшы выкладчык кафедры тэарэтычных асноў фізвыхавання В. І. Селіванаў.

На сваіх першых пасяджэннях, якія адбыліся ў гэтым годзе, інспектарская група заслухала пытанні аб правільнасці афармлення дакументацыі па ГПА на эканамічным, гісторыка-філалагічным і механіка-матэматычным факультэтах, аб гатоўнасці баз універсітэта да правядзення спаборніцтваў па зімовых відах спорту, аб медыцынскім абслугоўванні студэнтаў.

## Спорт

# НА КУБАК «ДРУЖБЫ»

У 1964 годзе Латвійскі ўніверсітэт стаў арганізатарам спаборніцтваў студэнцкіх мужчынскіх і жаночых каманд па гандболу.

Летась ганаровы прыз упершыню аспрэчвалі гандбалісткі ГДУ, якія занялі тады ў турнірнай табліцы трэцяе месца. Сёлета за кубак «Дружбы» вырашыла павесці барацьбу і наша мужчынская каманда. Спаборніцтвы было дамоўлена правесці ў спартыўнай зале ГДУ.

І вось гасцямі гамяльчан сталі студэнты Рыгі, Вільнюса, Тарту. Пасля ўрачыстага адкрыцця спаборніцтваў першымі на пляцоўку выйшлі гандбалісткі Вільнюса і Рыгі. Рыжанкі аказаліся мацнейшымі за сваіх саперніц і перамаглі з лікам 19:16. Святкавалі яны перамогу і ў наступныя дні, нанёсшы паражэнні камандам Тарту і Гомеля з лікам адпаведна 24:14 і 18:16. Студэнткі Рыгі сталі ўладальнікамі ганаровага прыза. Гаспадарам пляцоўкі, нашым гандбалісткам і сёлета дасталося толькі трэцяе месца.

Затое шматлікіх балельшчыкаў парадавала мужчынская каманда ГДУ. Лёгка адолеўшы спартсменаў Вільнюскага ўніверсітэта з лікам 33:17, нашы гандбалісты затым у цяжкай барацьбе нанеслі паражэнне камандзе Тарту (23:21) і ў апошняй сустрэчы турніра пераканаўча перамаглі рыжан — 33:25.



**На здымку:** сустракаюцца жаночыя каманды Рыгі і Вільнюса. Фота **У. Маглышава.**

У ДНІ ЗІМОВЫХ КАНІКУЛ

# З ДВАЙНОЙ КАРЫСЦЮ

Па заканчэнню зімовай залікова-экзаменацыйнай сесіі кафедра заалогіі і дарвінізму арганізавала пятую комплексную навуковую экспедыцыю. Яна праводзілася ў пасёлку Гогалі Рэчыцкага раёна. У дэканаце біялагічнага факультэта вырашылі ў гэты час выехаць на месца экспедыцыі і прыняць нормы ГПА па лыжнаму спорту ў студэнтаў і супрацоўнікаў.

Надвор'е выдалася як па заказу. Паказваючы прыклад моладзі, са старта адзін за другім адпраўляюцца на дыстанцыю супрацоўнікі кафедры заалогіі і дарвінізму. Гонку ўзначаліў старшы выкладчык А. Д. Ціханскі.

Услед за выкладчыкамі старт бяруць студэнты біялагічнага факультэта. Калі аўтар гэтых радкоў даваў старт апошняму ўдзельніку, паказаўся першы гоншчык, які імкліва набліжаўся да фініша. І вось ужо адзін за другім фінішны створ перасякаюць выкладчыкі, студэнты. Судзейская брыгада на чале з адказным па ГПА на факультэце выкладчыкам кафедры фізічнага выхавання Б. Г. Дзмітрыевым дакладна рэгіструе вынікі кожнага ўдзельніка лыжнай гонкі. Здача нарматываў праходзіць паспяхова. Таму загадчык кафедры заалогіі і дарвінізму прафесар Б. П. Савіцкі не затойвае свайго задавальнення. Барыс Парфёнавіч выказвае словы ўдзячнасці ў адрас кафедры фізічнага выхавання, якая забяспечыла лыжным інвентаром усю экспедыцыю, добра арганізавала прыём нарматываў комплексу ГПА.

Спорт — верны памочнік у вучобе, рабоце. І вельмі пахвальна, калі выкарыстоўваецца кожная магчымасць пакатацца з крутых гор, пахадзіць па лясных сцежках пасля напружанай зімовай сесіі.

Студэнты і супрацоўнікі кафедры заалогіі і дарвінізму яшчэ доўга будуць абмяркоўваць напружанасць барацьбы на дыстанцыі, у выніку якой усе ўдзельнікі спаборніцтваў здалі нормы ГПА па лыжнаму спорту.

**В. МАРЧАНКА,**
**нам. дэкана біялагічнага факультэта па спартыўна-масавай рабоце.**

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

**Дэканат факультэта фізічнага выхавання, кафедра фізічнага выхавання і спортклуб выказваюць глыбокае спачуванне выкладчыку кафедры фізічнага выхавання ШЫГАНАВУ Льву Барысавічу з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці БАЦЬКІ.**

АЗ 02143.

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ, профкома и месткома Гомельского государственного университета (на белорусском языке). Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю, Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Наш адрас: вул. Кірава, 119, корпус № 2, П 4-8, т. 6-75-10. Фармат 600 420 мм. Тыраж 2000 экз.

Заказ 858.